*Станіслаў Чавус*

# Музычная культура шляхты Вялікага Княства Літоўскага: прыярытэты і запазычанні

У экспазіцыі "Сталовая ізба" замкавага комплексу "Мір" плануецца экспанаванне музычных інструментаў, рэканструяваных па ўзорах канца XVI - пачатку XVII ст., паколькі цяжка сабе ўявіць тагачасную еўрапейскую палацавую культуру без інструментальнага грання. Палацы і замкі ў Рэчы Паспалітай часта называліся "месцамі ўрачыстасцей і музыкі".

Такім чынам, нам неабходна звярнуць увагу менавіта на свецкую інструментальную музыку, якая развівалася ў шляхецкім асяродку. Аднак, музычная культура Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XVI - пачатку XVII ст. была прадстаўлена ў самых разнастайных формах і кірунках, якія цесна ўзаемадзейнічалі, дапаўнялі і ўзбагачалі адзін аднаго.

Адзначым, што ў разгледжаны перыяд на беларускіх землях важнейшым цэнтрам развіцця прафесійнага музычнага мастацтва па-ранейшаму заставаўся рэлігійны асяродак. У Вялікім Княстве Літоўскім склалася спецыфічная поліканфесійная сітуацыя. Адпаведна суіснавалі і ўзаемадзейнічалі праваслаўная, уніяцкая, пратэстанцкая, каталіцкая музычныя традыцыі, а таксама музычныя традыцыі нехрысціянскіх культаў [1, с 11; 5, с. 595].

У праваслаўным абыходзе канца XVI ст. значнае развіццё атрымалі вакальныя распевы. Інструментальная музыка ў асяродку артадаксальнай царквы забараняецца [2, с 18].

Каталіцкая музыка шырока распаўсюдзілася на беларускіх землях разам з самім лацінскім абрадам напрыканцы XIV ст. Згодна з практыкай касцёльнай службы, харавы спеў звычайна суправаджаўся гучаннем аргана і інструментальнай капэлы. У каталіцкай сістэме адукацыі другой паловы XVI ст. інструментальнае гранне было абавязковым для вывучэння. Вядучую ролю ў музычна-адукацыйнай дзейнасці адыгрываў ордэн езуітаў, які арыентаваўся на апошнія дасягненні еўрапейскай музыкі [2, с. 23-25; 5, с. 960-961].

Трэба адзначыць, што менавіта каталіцызм найбольш спрыяў укараненню і развіццю арганнай музыкі ў Вялікім Княстве Літоўскім. Арган стаў папулярным музычным інструментам сярод прывілеяваных слаёў насельніцтва. У замках і палацах былі распаўсюджаны інструменты адносна невялікія па памерах - арган-пазітыў, які стацыянарна ўсталёўваўся на стол, ці на падлогу, а таксама арган-партатыў (перасоўны), які музыкант падчас грання трымаў у руках.

З сярэдзіны XVI ст. на землях Вялікага Княства Літоўскага распаўсюджваюцца ідэі Рэфармацыі. Пратэстанты актыўна займаліся друкаваннем нотных зборнікаў - выдалі "Берасцейскі канцыянал" (1558), "Нясвіжскі канцыянал" (1563), "Любчанскія канцыяналы" (другая палова XVI - 1-я чвэрць XVII ст.) і інш. Зборнікі ўтрымлівалі песні як рэлігійнага, так і свецкага зместу, былі папулярнымі ў магнацка-шляхецкім асяродку. Аднагалосныя песні найчасцей выконваліся пад інструментальны акампанемент. Так, на тытульным лісце выдання "Песні славянскай Каліопы" Крыштофа Клабана магчыма пабачыць выяву рэнесанснай лютні.

Уніяцкая музычная практыка напачатку была набліжана да літургікі праваслаўнай царквы, але з цягам часу ўзбагачалася пад уплывам заходнееўрапейскай

традыцыі - пачалі шырока выкарыстоўвацца арган і інструментальныя капэлы, што строга забаранялася ў праваслаўнай царкве. Вядома, што жыровіцкі базыльянскі манастыр меў адзін з лепшых арганаў у XVII ст. [5, с. 961-962; 2, с. 26-40].

На мясцовую музычную культуру ўплывалі таксама мусульманская і юдэйская традыцыі [1, с. 15-16].

Такім чынам, у канцы XVI - пачатку XVII ст. культавая музыка з'яўлялася адной з крыніц узбагачэння свецкай музыкі. Больш таго, паміж імі адсутнічала дакладная мяжа.

Вялікі ўплыў на музычную культуру магнацкага і шляхецкага асяродкаў Рэчы Паспалітай аказвала прафесійнае еўрапейскае (у канцы XVI ст. пераважна італьянскае) музычнае мастацтва. У ліку асноўных музычных інструментаў у гэты час знаходзіліся лютня, віёла, арфа, флейта, габой, труба, разнавіднасці клавесіна [3].

Менавіта ў гэты час у Рэчы Паспалітай пачалі масава ўзнікаць прыватныя аркестры і капэлы музыкантаў. Свецкая інструментальная музыка развівалася пры каралеўскіх, вялікакняжацкіх і магнацкіх дварах. Палацы і замкі сталі музычнымі цэнтрамі, дзе майстэрства грання дэманстравалі мясцовыя і замежныя музыканты. У адзін з самых значных аркестраў першай паловы XVII стагоддзя - капэлу Станіслава Любамірскага - былі запрошаны музыканты з розных італьянскіх цэнтраў. Пры вялікакняжацкім двары нават мелася пасада распарадчыка зводнай каралеўскай капэлы. Да 1592 года яе займаў Альбрэхт Радзівіл (1558-1592), а пасля - Леў Сапега (1557-1633). Вялікі літоўскі маршалак Альбрэхт Радзівіл не толькі добра плаціў «вопытным музыкантам», але і сам займаўся музыкай, як пра гэта піша ў панегірычным стылі К. Нясецкі (1682-1744): «У нашым касцёле свята-га. Яна ў Вільні ён узвёў на ахвяраванні галоўны алтар і арган, нават не саромеўся ў гонар вялікага Бога іграць на розных інструментах, таму што быў ён у музыцы добра дасведчаным» [10, с 32-35].

У 1586 г. пры гродзенскім двары караля Стэфана Баторыя (1533-1586) існавала інструментальная капэла, якая складалася са скрыпак, шалмеяў, трамбонаў, кларнетаў, клавіцымбала і іншых інструментаў. Сярод музыкантаў былі як выхадцы з Літвы і Полынчы, так і замежнікі. Капельмайстрам тут служыў Крыштоф Клабан (1550 - пасля 1616) - высокапрафесійны музыкант-інструменталіст, спявак і кампазітар, які нарадзіўся ў Круляўцы (Кёнігсбергу).

Інструментальная музыка Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVI ст. развівалася ў агульнаеўрапейскім кантэксце. Актыўна засвойваліся нямецкі, італьянскі музычныя рэпертуары.

Каля 1600 г. кароль Жыгімонт III запрасіў 23 італьянскіх музыкантаў для сваёй капэлы ў Варшаве. Прыклад каралеўскага двара, частыя паездкі ў Заходнюю Еўропу, якія давалі магчымасць пазнаёміцца з італьянскай музыкай,моцна ўздзейнічалі на густ шляхты. З гэтага часу пачаўся значны італьянскі ўплыў на музыку Рэчы Паспалітай. Вялікі мецэнат і аматар мастацтваў, спадчынны прыдворны маршалак Зыгмунт Мышкоўскі, чалавек вельмі дасведчаны ў музыцы і выхаваны пры музычным двары ў Мантуі, валодаў цудоўнай капэлай. Нават сам Жыгімонт III наймаў у часовае карыстанне яго музыкантаў. Італьянскія музыканты прысутнічалі таксама ў капэлах М. Вольскага, князёў Радзівілаў і інш.

Пад уплывам еўрапейскага Адраджэння склад музычных інструментаў у капэлах значна пашырыўся.

Да ўжо існаваўшых струнных і духавых дадаліся новыя разнавіднасці. Сярод іх значнае месца адводзіцца віёлам - сямейству струнных смычковых інструментаў. Віёла (іт viola) узнікла ў канцы XV - пачатку XVI ст. і адразу пачала выкарыстоўвацца ў арыстакратычным асяродку, эстэтычныя патрабаванні якога цалкам адпавядалі гукавой характарыстыцы інструменга. Віёлы валодалі сістэмай рэзануючых струн, ваганні якіх рабілі яе гук мяккім і бархацістым. Доўгі час гучанне гэтага інструмента лічылася ў музыцы ўзорам вытанчанасці [6; 7].

Сярод шчыпковых музычных інструментаў у разгледжаны перыяд галоўнае месца займае лютня (польск. lutnia, ад арабск, "al'ud"-драўляны інструмент, па гучанню блізкі да гітары). У Еўропу яна прыйшла з Блізкага Усходу ў канцы XIV ст., а ўжо да пачатку XVI стагоддзя для гэтага інструмента існавала шмат рэпертуару. Галоўным чынам, як ужо адзначалася вышэй, пад акампанемент лютні выконвалі песні. У лютні кароткі корпус; верхняя частка плоская, а ніжняя нагадвае паўсферу. Да шырокай шыйкі прыладжаны грыф, які падзяляецца ладамі, а галоўка інструмента адагнута назад амаль пад прамым вуглом. Дванаццаць струн групуюцца парамі. Гук здабываюць як пальцамі, так і медыятарам [9].

Лютневая музыка ў Рэчы Паспалітай дасягнула высокага прафесійнага ўзроўню. У другой палове XVI ст. тут працавалі мясцовыя і замежныя лютністы Валянцін Бакфарк, італьянец Дыямед Ката, Якуб Полак, Войцэх Длугарай. Напісаныя імі творы ў XVII ст. увайшлі ў найбольш значныя зборнікі заходнееўрапейскай лютневай музыкі (напрыклад, зборнікі Ж.-Б. Бесарда і Яхіма ван дэн Хова) [2, с 26-63].

У палацах гучала таксама музыка славянскага паходжання: мазур, абэрак, казачок, танцы - папярэднікі паланеза. "Літоўская капала", у склад якой уваходзілі 15 мясцовых музыкантаў, існавала ў Гродне з 1543 г. Заходнееўрапейскія мелодыі таксама часам перапрацоўваліся ў адпаведнасці з мясцовым густам [5, с 962].

Адной са сфер, якія ўплывалі на мастацкія густы шляхты Вялікага Княства Літоўскага і ўсёй Рэчы Паспалітай, была народная музыка. Вядома, што пры дварах манархаў і магнатаў часам гралі капэлы народных музыкантаў, а таксама ладзіліся святы, падчас якіх выступалі скамарохі. Традыцыйныя інструментальныя найгрышы выконваліся ў інтэрмедыях паміж дзеямі тэатральных пастаноў [10, с 33].

Шырокае выкарыстанне ў Вялікім Княстве Літоўскім і Польшчы атрымала скрыпка, якая была прыўнесена ў прафесійную музыку менавіта з народнай культуры. Выява скрыпкі сустракаецца на надмагіллі Ф. Ягелона ўжо ў 1510 годзе. Марцін Агрыкола ў сваім творы "Musica Instrumentalis Deutsch" (1545) згадвае "польскія скрыпкі" - вельмі распаўсюджаны ў Польшчы музычны інструмент. У хуткім часе скрыпка становіцца здабыткам паўночнаітальянскай прафесійнай музыкі, а з пачатку XVII ст. амаль усе еўрапейскія кампазітары пачалі ствараць музыку для гэтага шструмента [4; 8].

Такім чынам, на музычны густ магнатаў і шляхты Вялікага Княства Літоўскага канца XVI - XVII ст. уплыў аказвала як еўрапейская прафесійная, так і традыцыйная народная музыка як мясцовага паходжання, так і прыўнесеная з іншых культур; як свецкае, так і рэлігійнае музычнае мастацтва. Усё гэта неабходна ўлічваць пры набыцці музейных прадметаў для адлюстравання музычнай культуры ў Мірскім замку.

**Літаратура:**


1. Дадзіёмава В.У. Аркестровае выканальніцтва Беларусі // Полацак: Выданьне Беларускага кулыурна-асветніцкага цэнтра. Кліўленд, ЗША, 1991. № 6-7. С 11-16.

2. Дадзіёмава В.У Нарысы гісторыі музычнай культуры Беларусі. Мінск, 2001. С 14-49.

3. Музыкальная энциклопедия [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://muzipedia.ru/ (Дата доступа: 26.07.2009).

4. Муратов С В. Скрипка, вопросы истории происхождения // Журнал «Самиздат» [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://zhurnal. lib.ru/rn/muratow_s_w/violin.shtml (Дата доступа: 25. 04.2010).

5. Республика Беларусь: Энциклопедия: В 6 т. Т. 1 / Редкол.: Г.П. Пашков и др. Мн.: БелЭн, 2005. 1040 с: илл.

6. Струнные смычковые. Виола да гамба // Encyclopedia of Musical Instruments [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://eomi.ws/bowed/viola-da-gamba/ (Дата доступа: 24. 04.2010).

7. Струнные смычковые. Виола // Encyclopedia of Musical Instruments [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://eomi.ws/bowed/viol/ (Дата доступа: 24. 04.2010).

8. Струнные смычковые. Виола // Encyclopedia of Musical Instruments [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://eomi.ws/bowed/violin/ (Дата доступа: 24. 04.2010).

9. Струнные щипковые. Лютня // Encyclopedia of Musical Instruments [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://eomi.ws/plucked/lute/ (Дата доступа: 25. 04.2010).

10. Цеханавецкі А. Міхаіл Казімір Агінскі і яго "сядзіба музаў" у Слоніме [пераклад з нямецкай мовы У Сакалоўскага; навуковы рэдактар перакладу і аўтар прадмовы А. Мальдзіс]. Мінск: Про Хрысто, 2006. 269 с